

# «Зямля святая, яна наша маці...»



**На Беларусі шмат мясцін, рытуальнымі цэнтрамі якіх з'яўляюцца рукатворныя курганы. І гэта зусім не выпадкова. Са старажытных часоў курганы былі месцам пахавання найбольш знакамітых продкаў, людзей неардынарных ва ўсіх адносінах. Таму часам курганы называлі валатоўкамі, бо, у адпаведнасці з легендамі, там былі пахаваны волаты-першапродкі.**

Адной з найбольш пакутлівых старонак Беларусі з'яўляецца Вялікая Айчынная вайна, пасля якой на месцах асабліва жорсткіх баёў былі ўзведзены мемарыяльныя комплексы. Сярод іх вылучаліся ўсё тыя ж курганы. Найбольш знакаміты — Курган Славы пад Мінскам. Сюды была прывезена зямля з мясцін, дзе адбываліся ключавыя падзеі той вайны. У цэнтры Мінска, на плошчы Перамогі, быў створаны мемарыял. У спецыяльных урнах там знаходзіцца зямля, прывезеная з усіх гарадоў-герояў. Чаму ж менавіта зямля аказалася тым свяшчэнным звяном, якое паяднала жывых і загінулых, мінулае і сучаснасць? Вытокі такой выключнай пашаны трэба шукаць у нашай традыцыйнай культуры, шматлікіх абрадах, звычаях, творах вуснай народнай спадчыны.

## "Родная зямліца, зямля-карміцелька, сырая зямля-маці"

Такімі ўзнёсла-цудадзейнымі словамі людзі звярталіся да зямлі і ў хвіліны шчасця, і тады, калі гора хіліла галаву долу. Славянскія народы параўноўвалі зямлю з жанчынай, і праз пэўны час здарылася так, што ўвесь земляробчы каляндар будаваўся па прынцыпе жыццёвага колазвароту жанчыны: зямля спіць, потым абуджаецца і зацяжарвае ад сакральна-магічнага акта ўздзеяння на яе (ворыва і сяўбы), дае ўраджай, а можа адказаць няўродам, стогне, плача, гневаецца за грахі людскія. Яна ўвабрала ў сябе ўсе прыкметы мацярынства: у яе сеюць насенне (семя), не адзін раз карпатліва даглядаюць, назіраюць за ростам пасеваў, быццам за толькі што народжаным дзіцем.

Па ўяўленнях нашых далёкіх продкаў, зямля заўсёды надзялялася самай высокай ступенню святасці і чысціні. Яна не цярпела ніякай брыдоты і нечысці. У сувязі з гэтым яе статус быў нароўні з вадой. Напрыклад, правіла народнага этыкету патрабавала абавязкова памыць рукі перад сталаваннем, нават падчас жніва ў полі. Аднак калі там не было вады, рукі выціралі аб зямлю. Лічылася, што яна валодае той жа ачышчальнай сілай, што і вада.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Згодна з народным этыкетам зямлю забаранялася біць калом, бізуном, розгамі: “Зямля святая, яна наша маці, яна нас жывых корміць, а па смерці да сябе прыхіляе”.

Народныя лекары перакананы: той, хто плюе на зямлю, правакуе цяжкія захворванні органаў дыхання. А ва ўсіх славянскіх народаў самай моцнай клятвай (ад якой ні пры якіх умовах нельга было адрачыся) лічылася тая, калі чалавек цалаваў, а потым з’ядаў жменьку зямлі.

Славянскія легенды сцвярджаюць, што старажытныя людзі доўгі час не ведалі смаку хлеба, таму што пераважна сілкаваліся пладамі дуба — жалудамі. З цягам часу нябесныя ахоўнікі навучылі іх араць і засяваць зямлю: *“Тасподзь за залатым плугам ішоў, Святы Пётр паганяў, Маці Боская насенне насіла і сеяла”*. З таго часу ўзнікае земляробчы каляндар, які парадкаваў усе сельскагаспадарчыя клопаты селяніна. У ім былі сканцэнтраваны рознабаковыя стасункі чалавека з зямлёй: у адным выпадку ўзнікалі даволі жорсткія рэгламентацыі, на працу накладвалася строгая забарона, або, наадварот, у дакладна вызначаныя дні трэба было выконваць пэўныя рытуальныя дзеянні, каб папярэдзіць град, засуху, неўраджай.



## Веснавое абуджэнне, “адмыканне” зямлі

Як усё жывое, зямля нараджалася вясной, а памірала ўвосень. Гэтая акалічнасць стала прычынай узнікнення шэрагу розных рытуальна-абрадавых дзеянняў, якія былі скіраваны на тое, каб, з аднаго боку, паспрыяць спору, урадлівасці зямлі, а з другога — накладвалі на паводзіны чалавека даволі жорсткія маральна-этычныя патрабаванні ў адносінах да яе. Напрыклад, на Масленіцу рабілі снежныя горкі, аблівалі іх вадой, а потым толькі што ўзяўшыя шлюб маладыя пары каталіся з іх на санках. Штучны лёдавы пагорак — знак цяжарнасці зямлі, а катанне з яго мела двухбаковую накіраванасць: вірлівая моладзь імкнулася абудзіць зямлю, а тая ў сваю чаргу павінна была паспрыяць жыццядайнаму патэнцыялу пары. Напрыканцы Масленічнага тыдня людзі збіраліся ўсёй вёскай за ваколіцай і спальвалі саламяную Марану — смерць, увасабленне зімы. Пасля кожны ўдзельнік абраду браў крыху попелу, ішоў на сваё жытнёвае поле, рассыпаў яго па ім і затоптваў у снег: няхай адышоўшае ў нябыт прарасце ўлетку новым коласам.



Абуджэнне Зямлі пасля доўгага зімовага спачыну было прымеркавана да канца сакавіка або да пачатку красавіка і найчасцей за ўсё супадала са святам *Звеставання*. У гэты час зямля “прачынаецца і адкрывае свае нетры”. Вялікім гарахом лічылася чапаць яе ў такі дзень — араць, гарадзіць плот. Паўсюдна лічылі, што калы, забітыя ў зямлю да ворыва і сяўбы, “забіваюць” урадлівасць матухны-зямлі і пасеянае зерне можа не прарасці. Вясковы люд строга сачыў за тым, каб ніхто да *Звеставання* не ўваткнуў у зямлю аніякай галінкі, каб не патурбаваць яе раней часу. Лічылася, што такія парушэнні выклікаюць халодную вясну і засушлівае лета.

Гэты ж самы сэнс — абуджэнне зямлі — укладваўся беларусамі і ў абрад велікоднага качання яек (святочная гульня таксама адбывалася на самым высокім месцы ў вёсцы). Для павелічэння ўрадлівасці зямлі па ўсіх кутках свайго прысядзібнага ўчастка гаспадар утыкаў галінкі вярбы, асвячонай у храме на *Вербніцу*. Ці, напрыклад, адразу пасля вяртання дадому з велікоднага ўсяночнага багаслужэння гаспадар садзіў за стол усю сям’ю і адбывалася доўгачаканая святочная трапеза, калі можна было ўволю наесціся смажаніны, вяндліны, каўбасы, сыру з маслам. Рэшткі, якія заставаліся на стале (шалупінне яек, косці, кавалачкі хлеба і яйка), бацька нёс на жытнішча і злёгку прысыпаў зямлёй.

**Калы, забітыя ў зямлю да ворыва і сяўбы, “забіваюць” урадлівасць матухны-зямлі.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



*Радаўніца,* як і *Звеставанне,* з'яўлялася той сакральна-магічнай мяжой, якая, з аднаго боку, стрымлівала працу на зямлі, а з другога — наадварот, дазваляла яе распачынаць. Залатое правіла народнай культуры патрабавала: перш чым узяцца за лапату і пачаць наводзіць парадак на сваім прысядзібным участку, трэба было пайсці і навесці парадак на магілах сваіх продкаў, каб заручыцца іх падтрымкай, таму што яны паўнапраўныя ўладары зямлі-матухны. Таму нават калі *Радаўніца* адзначаецца даволі позна, то ўсё роўна спачатку наводзіцца парадак на могілках, а потым ужо гаспадар распачынае ворыва і сяўбу.

### Імяніны ў зямлі...

Для старажытных славянскіх вераванняў характэрна персаніфікацыя зямлі. Яна, як і чалавек, можа спаць, абудзіцца, зацяжарыць, урадзіць, стагнаць, плакаць, таму быў дзень — 23 мая на Св. Зілота, калі яна святкавала "свае імяніны". Лічылі, што ў гэты дзень нельга араць, сеяць, гарадзіць плот, бо зямля адпачывае.

*Духаў дзень* лічылі найвялікшым днём шанавання зямлі. У некаторых мясцінах Беларусі існаваў выключны па сваім эмацыянальным змесце звычай: жанчыны выходзілі ў поле, станавіліся на калені і тройчы цалавалі зямлю, называючы яе імяніннніцай. У час паміж *Духавым* і *Пятровым днямі* непажадана было распачынаць будаўніцтва новага дома, асабліва закладваць пад яго фундамент. Людзі былі перакананы, што ў гэтым доме шчасця не будзе.

**Біць зямлю палкай, вяроўкай, нагой — усё роўна што біць родную маці ў жывот.**

### Час мацярынства

Зямля як сімвал мацярынства шырока прадстаўлена ў шматлікіх легендах і павер'ях беларускага народа. Перш чым распачаць сяўбу, селянін звяртаўся да багоў і святых з просьбай напаіць сырую зямлю-маці халоднай расой, каб адрадзіць яе ўрадлівасць. Перасохлую або неўрадлівую зямлю параўноўвалі з удавой або бяздзетнай жанчынай. Таму адносіны да яе можна было параўнаць з адносінамі да роднай маці: біць зямлю палкай, вяроўкай, нагой — усё роўна што біць родную маці ў жывот; *"Без патрэбы няможна зямлю біць, зневяраць ці паскудзіць чым-небудзь, бо зямля святая, яе Бог нам даў як матку, а матку трэба шанаваць".*

Напрыканцы жніва духу зямлі прыносілася ахвяраванне. Па даўняй традыцыі жанчыны-жнеі пакідалі на полі некалькі каласоў — "вялесаву бараду" (сем, дзевяць, дванаццаць, трыццаць тры або сорак). Лічылі, што менавіта ў іх знаходзіўся спарыш, спарына — асаблівая сіла зямлі, якая павінна будзе адрадзіць ніву на наступны год. "Бараду" прыгіналі да зямлі, клалі ў сярэдзіну хлеб, соль, кавалачак сала, кланяліся ёй, а часам качаліся цераз яе, прыгаворваючы: *"Нійка, нійка, аддай маю сілку на новую нійку!"*

### Восеньскае "засыпанне", або "замыканне" зямлі

Пасля таго, як зямля выканала сваю галоўную ролю — узгадавала і аддала новы ўраджай, яна спакваля пачынала засынаць, як бы згортвалася, закрывалася да наступнага года. Як і веснавое "адмыканне", так і восеньскае "замыканне" зямлі адбывалася паступова, у некалькі паслядоўных этапаў.

Стаўленне да зямлі як да жывога арганізма сфарміравала ў асяроддзі беларусаў забарону чапаць яе ад *Пакроваў* (у некаторых месцах ад *Узвіжання*) і да *Звеставання* або *Радаўніцы.* На Пакровы зямлю-матухну параўноўвалі з вобразам Маці Боскай, якая ўратавала чалавецтва: *"На Пакроў зіма закрывае лета, а Бог пячатае зямлю, і пасля гэтага дня да вясны ніхто не можа яе чапаць".*

**Аксана КАТОВІЧ**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА**



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ